шамі. Асн. адзінкай абкладання феад. павіннасцямі служыў *дым* (сял. гаспадарка), але «валашчане» (члены сельскіх і валасных абшчын) неслі калектыўную адказнасць за спраўнае выкананне ўсіх устаноўленых павіннасцей. Да канца 15 ст. Д. былі пераважнай катэгорыяй сялян, аднак далейшае развіццё таварна-грашовых адносін, рост сувязей сельскай гаспадаркі з унутраным і асабліва са знешнім рынкам абумовілі працэс паступовай рэарганізацыі сістэмы феад. эксплуатацыі сялянства. Да сярэдзіны 16 ст. на З і часткова ПнУ тэр. Беларусі Д. паступова ператварыліся ў паншчынных (гл. *Цяглыя сяляне*) і чыншавых (гл. *Асадныя сяляне*) сялян. У 1-й пал. 16 ст. асноўным рэгіёнам Д. па-ранейшаму заставалася Падняпроўе, дзе пераважалі дзярж. («гаспадарскія») уладанні («валасці»): Бабруйская, Гомельская, Крычаўская, Любашанская, Магілёўская, Мазырская, Прапойская, Рэчыцкая, Свіслацкая, Чачэрская і інш. Аднак і тут адбываўся працэс частковай або поўнай замены даніны грашамі. У выніку аграрнай рэформы 1560 Д. гаспадарскіх паднепроўскіх валасцей ператвараліся ў *чыншавых сялян.*

*Літ.*: Ефименко А. Южная Русь: Очерки, исслед. и заметки. Спб., 1905. Т. 1. С. 424—436; Пичета В.И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. [2 изд.] М., 1958; гл. таксама да арт. *Даніна.* *Міхаіл Спірыдонаў.*

**ДАНУКАЛАЎ** Аляксей Фёдаравіч (партыз. псеўд. Аляксей; 29.2.1916, с. Варасляеўка Дзергачоўскага р-на Саратаўскай вобл. — 27.4.1944), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на тэр. Віцебскай вобл. ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Балашоўскі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі (1936), Іркуцкае ваен. вучылішча (1941). У Чырв. Арміі з 1937. З чэрв. 1941 на фронце, удзельнік абароны Лепеля, Оршы, Смаленска. Трапіўшы ў акружэнне, у жн. 1941 арганізаваў партыз. атрад «Радзіма», які дзейнічаў у Смаленскай і Віцебскай абл. У крас. 1942 атрад рэарганізаваны ў брыгаду «Аляксей», камандзірам якой быў Д. (пазней партыз. брыгады яго імя). Падпалкоўнік Д. загінуў у баі ў час выхаду з блакады. У Лепелі на магіле Д. пастаўлены помнік. Яго імем названы вуліцы ў Віцебску, Лепелі, Лёзне, Ушачах, калгас у Лёзненскім і саўгас у Сенненскім, школа ў Віцебскім р-нах; у в. Кавалі Лёзненскага р-на мемар. музей Д., устаноўлены яго бюст.

**ДАНЯЛЮК** Аляксандр Пятровіч (парт. псеўд. Эдмунд Стафанскі, Олек, Зянон; 30.11.1897, Варшава — люты 1937), дзеяч Кампартыі Польшчы і рэв. руху ў Зах. Беларусі. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 чл. Чугуеўскага рэўкома. З 1919 у Польшчы. У 1921—23 сакратар акр. к-та Дамброўскага басейна Кампартыі Польшчы, чл. ЦК Кампартыі Усх. Галіцыі, у 1923—29 канд. у чл. ЦК КПП. Удзельнік арганізац. афармлення КПЗБ, прадстаўнік ЦК КПП на II (1924) канферэнцыі КПЗБ. У 1924 кааптаваны ў ЦК, чл. Сакратарыята ЦК КПЗБ. Дэлегат V (1924) кангрэса Камінтэрна. За рэв. дзейнасць тройчы арыштаваны ўладамі Польшчы. У 1930 у апараце Выканкома Камінтэрна. У 1931—35 у Кампартыі Румыніі: чл. ЦК і Палітбюро ЦК. З канца 1935 у СССР на гасп. рабоце. Аўтар публіцыст. артыкулаў. У лют. 1937 незаконна рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1955.



А.Ф.Данукалаў.

**ДАПАМОЖНЫЯ ГІСТАРЫЧНЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ**, гл. *Спецыяльныя гістарычныя навукі.*

**ДАРАВАЛЬНАЯ ГРАМАТА ГАРАДАМ 1785** («Грамата на правы і выгоды гарадам Расійскай імперыі»), заканадаўчы акт расійскай імператрыцы Кацярыны II. Выдадзена 21.4.1785 адначасова з *Даравальнай граматай дваранству 1785.* Складалася з «Гарадавога палажэння» і «Рамеснага палажэння». Вызначала агульную арганізацыю кіравання гарадамі і статус гараджаніна. Паводле граматы гараджане падзяляліся на 6 разрадаў: 1) знакамітыя грамадзяне — вучоныя, музыканты, мастакі, з акадэмічнай адукацыяй, чыноўнікі, пераведзеныя ў гэты разрад за службу, буйныя гандляры-аптавікі з капіталам не менш як 50 тыс. руб., банкіры з капіталам не менш як 100 тыс. руб., багатыя ўладальнікі нерухомай маёмасці, марскіх суднаў і інш. (знакамітыя грамадзяне маглі за службу атрымаць дваранскі тытул); 2) купцы трох *гільдый*; 3) іншагароднія і замежныя госці — гандляры, запісаныя па рэвізіі ў іншым горадзе, або прыезджыя з іншай дзяржавы; 4) гарадскія абывацелі — гараджане з дваран, духавенства, разначынцаў, гандляроў і інш., якія валодалі ў горадзе зямлёй ці будынкамі; 5) рамеснікі, запісаныя ў *цэхі*; 6) мяшчане — жыхары гарадоў, якія займаліся промысламі, агародніцтвам і не адносіліся ні да адной з названых груп, паводле свайго становішча яны набліжаліся да *дзяржаўных сялян* і неслі аднолькавыя з імі павіннасці. Грамата дазваляла пераход з адной групы ў другую; для гэтага неабходна мець патрэбны капітал ці маёмасць. Гараджане атрымалі таксама права займацца прамысл. дзейнасцю без спец. дазволу. Гараджане ўсіх шасці разрадаў вылучалі дэпутатаў на гар. сход, на якім выбіралася *гарадская дума* на чале з *гарадскім галавой.* Арганізацыя кіравання гарадамі Беларусі адрознівалася ад арганізацыі кіравання ў Цэнтральнай Расіі. У бел. гарадах, якія валодалі раней *магдэбургскім правам*, захоўваліся *магістраты.* У судаводстве выкарыстоўваліся не толькі законы Расійскай імперыі, але і *Статут Вялікага княства Літоўскага 1588.* Яўрэйскае насельніцтва гарадоў Беларусі падпарадкоўвалася *кагалу.* Аднак паступова кагал страціў былое значэнне і трапіў у залежнасць ад магістрата, які рэгламентаваў яго дзейнасць і фактычна сканцэнтраваў у сваіх руках усю паўнату ўлады ў горадзе, у т.л. і ў адносінах да яўр. часткі насельніцтва. Д.г.г. 1785 сістэматызавала і ўзаконіла прывілеі багатых гар. вярхоў, дазволіла гараджанам больш свабодна займацца промысламі і гандлем.

*Літ.*: Полн. собр. законов Российской империи. Собр. 1-е. Т. 22, № 16 188; Кизеветтер А.А. Городовое положение Екатерины II 1785. М., 1909; Рындзюнский П.Г. Городское гражданство дореформенной России. М., 1958. *Анатоль Люты.*

**ДАРАВАЛЬНАЯ ГРАМАТА ДВАРА́НСТВУ 1785** («Грамата на правы, вольнасці і прывілеі высакароднага расійскага дваранства»), заканадаўчы акт расійскай імператрыцы Кацярыны II. Выдадзена 21.4.1785 адначасова з *Даравальнай граматай гарадам 1785.* Складалася з уводзін, 4 раздзелаў і 92 артыкулаў, у т.л. аб асабістых прывілеях *дваран*, аб дваранскіх сходах і таварыствах у намесніцтвах, настаўлення па складанні і вядзенні дваранскіх радаводных кніг, доказаў высакародства і інш. Вылучалася 15 бясспрэчных доказаў высакародства: для тых, хто валодаў чынамі і маёмасцю, атрыманымі ад каранаванай улады, — праз дыпломы, гербы, патэнты, граматы, указы і г.д., паводле паходжання — праз купчыя, закладныя, духоўныя граматы і інш. Дваранскія прывілеі абвяшчаліся непарушнымі. Доказы запісваліся ў радаводныя кнігі, што вяліся ў кожным павеце і намесніцтве. Грамата пацвердзіла выключныя правы дваранства на набыццё населеных вёсак і гар. двароў, продаж прадуктаў гаспадарання, завядзенне фабрык і заводаў, кірмашоў, правы на лясы і зямельныя нетры. Дваране вызваляліся ад абавязковай дзярж. службы, маглі выязджаць за мяжу або служыць у саюзных дзяржавах. Яны не падлягалі абкладанню асабістым падушным падаткам, цялеснаму пакаранню. Абвяшчалася недатыкальнасць гонару і звання двараніна, яго жыцця і маёмасці: іх можна было страціць толькі за цяжкія злачынствы паводле суда роўных сабе і з найвыса-